# Справаздача аб апрабацыі адукацыйнага вэб-квэста «Хлопчык Ванятка ў краіне дзіцячай літаратуры» на І сесіі марафона «Купалаўскія праекты - 2025»

**Аўтар вэб-квэста**: Крофта Ганна Уладзіміраўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы».

**Мэта і задачы вэб-квэста.**

Мэта: у займальнай форме пазнаёміць з творчасцю і біяграфіяй беларускіх пісьменнікаў XX - пач. XXI ст.

**Задачы:**

1) пашырыць, абагульніць і сістэматызаваць веды студэнтаў па дысцыплінах «Айчынная дзіцячая літаратура ў дашкольнай адукацыі», «Дзіцячая літаратура ў пачатковай адукацыі»;

2) узбагаціць чытацкі вопыт;

3) стварыць умовы для развіцця пазнавальнага інтарэсу пры вывучэнні беларускай дзіцячай літаратуры.

Вэб-квэст разлічаны на студэнтаў 2-3 курсаў спецыяльнасцей «Пачатковая адукацыя» і «Дашкольная адукацыя».

Асяродкам навучання быў сайт, створаны аўтарам на платформе sites.google.com. Спасылка на сайт: сайт.

Асноўны змест вэб-квэста адлюстраваны на старонцы Візітоўка праекта.

Узаемадзеянне ўдзельнікаў апрабацыі вэб-квэста ажыццяўлялася праз:

- асабістую пошту (@gmail) удзельнікаў;
- месэнджары (Telegram);
- дакумент для сумеснага рэдагавання (Табліца перамяшчэння).

## Статистика

Для ўдзелу ў апрабацыі вэб-квэста «Хлопчык Ванятка ў краіне дзіцячай літаратуры» зарэгістравалася 27 чалавек, у ходзе апрабацыі

далучыліся яшчэ 20 удзельнікаў. Усе яны выканалі заданні вэб-квэста і атрымалі кодавую фразу.

Работа складалася з некалькіх этапаў:

- рассылка запрашэнняў для ўдзелу праз асабістую пошту, месэнджары;
- кантроль за праходжаннем вэб-квеста і напамін (праз асабістую пошту) аб тэрмінах праходжання вэб-квеста і неабходнасці выканання ўсіх этапаў, уключаючы размяшчэнне ў Табліцы перамяшчэння;
- рассылка на запаўненне рэгістрацыйнай анкеты, Табліцы перамяшчэння, пуцявога ліста і выніковай формы.

Удзельнікі апрабацыі карысталіся сэрвісам https://learningapps.org. Праходзячы вэб-квэст, яны запоўнілі Табліцу перамяшчэння, пуцявы ліст і выніковую форму.

У Табліцы перамяшчэння удзельнікамі былі выказаны пажаданні, дадзена ацэнка вэб-квэста.

Прааналізаваўшы вынікі апрабацыі, аўтар прыйшоў да высновы, што вэб-квэст «Хлопчык Ванятка ў краіне дзіцячай літаратуры» не выклікаў цяжкасцей ва ўдзельнікаў. Усе заданні адзначаны як зразумелыя і не надта складаныя. Вэб-квэст выклікаў цікавасць ва ўдзельнікаў апрабацыі. Ён можа выкарыстоўвацца на занятках па дысцыплінах «Айчынная дзіцячая літаратура ў дашкольнай адукацыі», «Дзіцячая літаратура ў пачатковай адукацыі» ў якасці сродку абагульнення і сістэматызацыі ведаў, а таксама для самаправеркі студэнтамі сваіх ведаў па гэтых дысцыплінах.

Аўтар шчыра дзякуе арганізатарам і каардынатарам міжнароднага марафона «Купалаўскія праекты» за слушныя парады, карысныя рэкамендацыі, каштоўныя веды. Дзякуй удзельнікам каманды «Універсум» за пастаянную падтрымку. Словы асаблівай удзячнасці хацелася б выказаць кіраўніку міжнароднага марафона «Купалаўскія праекты» Ніне Пятроўне Макаравай і кіраўніку каманды «Універсум» Алене Мікалаеўне Лапкоўскай за новыя веды і навыкі, за вашу нястомную працу!

01.06.2025
Г.У. Крофта